Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»

*Філалагічны факультэт*

# ДЗЯСЯТЫЯ ТАНКАЎСКІЯ ЧЫТАННІ
# (да Года культуры ў Беларусі)

*Зборнік навуковых артыкулаў*

Репозиторий БГПУ

Мінск 2016

УДК 821.161.3
ББК 83.3(4Беи)
Д431

Рэдкалегія:
доктар філалагічных навук, прафесар В. Д. Старычонак (адк. рэд.);
кандыдат філалагічных навук, дацэнт І. М. Гоўзіч;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт Н. В. Заяц

Рэцэнзенты:
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі журналістыкі і менеджменту СМІ Інстытута журналістыкі БДУ І. Д. Воюш;
кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры рускай і зарубежнай літаратуры БДПУ, дацэнт А. П. Жыганава

Д431 **Дзясятыя** Танкаўскія чытанні (да Года культуры ў Беларусі) : зб. навук. артыкулаў / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: В. Д. Старычонак, І. М. Гоўзіч, Н. В. Заяц ; адк. рэд В. Д. Старычонак. – Мінск : БДПУ, 2016. – 424 с.
ISBN 978-985-541-284-8.

У зборнік навуковых артыкулаў увайшлі матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Дзясятыя Танкаўскія чытанні», што праходзіла 16 верасня 2016 года ў БДПУ.

Адрасуецца навуковым работнікам, выкладчыкам, аспірантам, студэнтам, у сферы навуковых інтарэсаў якіх знаходзіцца асэнсаванне мастацкага вопыту беларускага класіка ў літаратуразнаўчым, лінгвістычным, культуралагічным і метадычным аспектах.

**УДК 821.161.3**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-284-8**

© БДПУ, 2016

# Уступнае слова

Паважаныя ўдзельнікі канферэнцыі! Шаноўныя госці!

Кожныя два гады гуманітарыі з Беларусі і іншых краін свету збіраюцца ў нашым універсітэце на традыцыйныя «Танкаўскія чытанні». Шматгранная творчая асоба беларускага класіка, імя якога з гонарам носіць БДПУ, дае літаратуразнаўцам, лінгвістам, культуролагам і педагогам неабмежаваныя магчымасці для новых пошукаў і адкрыццяў. Задачы міжнароднага форума не абмяжоўваюцца толькі навуковымі – канферэнцыя яднае прадстаўнікоў розных краін і нацыянальнасцей, садзейнічае наладжванню міжкультурных сувязей, усталяванню дзелавых і сяброўскіх кантактаў.

Сімвалічна, што юбілейныя дзясятыя чытанні праводзяцца ў рамках комплексу мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года культуры. Выступленнем на сённяшняй міжнароднай канферэнцыі вядомыя беларускія і замежныя вучоныя, а таксама маладыя даследчыкі ўносяць свой уклад у пашырэнне навукі, асветы і культуры, узбагачаюць сусветны гуманітарны досвед.

Творчасць Максіма Танка – яркі прыклад гарманічнага спалучэння нацыянальных традыцый і набыткаў замежнай літаратуры, беларускай ідэнтычнасці і мультыкультурнага вопыту. Так, дзякуючы Танкавым перакладам па-беларуску загучалі творы рускіх класікаў А. Пушкіна і У. Маякоўскага, украінцаў П. Тычыны і М. Рыльскага, палякаў Ю. Славацкага і Ю. Тувіма, літоўца А. Венцлавы і латыша Я. Судрабкална... Пясняр з Нарачы пашырыў тэматычны дыяпазон, фармальныя рамкі і геаграфічныя абсягі беларускага слоўнага мастацтва. З-пад яго пяра выходзілі перакладныя і арыгінальныя вершаваныя формы, уласцівыя еўрапейскай вербальнай культуры, паэзіі народаў Блізкага і Сярэдняга Усходу, японскай лірычнай традыцыі.

Народны паэт Беларусі не толькі адаптаваў на беларускай глебе лепшыя ўзоры іншанацыянальных літаратур, але і годна прэзентаваў беларускую культуру свету. Шматлікія выдатныя творы нашага класіка, перакладзеныя на розныя мовы, знаёмяць не толькі з айчынным мастацкім словам, але і з гісторыяй, каштоўнасцямі, менталітэтам народа.

Мультыкультурная асоба, паэт-інтэлектуал Максім Танк, аднак, ніколі не страчваў духоўнай повязі з Радзімай, з вытокамі. Уласнай творчасцю ён пацвердзіў і замацаваў статус беларускай літаратуры як найбагацейшага складніка літаратуры сусветнай, упісаў яе ў шырокі культурны кантэкст.



Репозиторий БГПУ

Знойдзены:
Невядомая карціна Рафаэля...
Невядомая партытура Бетховена...
Невядомыя строфы Пушкіна...
А на папялішчы купалаўскай хаты –
Яго жалейка...
Нічога дзіўнага!
Каму невядома, што яны жывуць
І твораць вечна!

Паэтычная спадчына Максіма Танка ўжо стала набыткам вечнасці, папоўніла скарбонку з мастацкіх шэдэўраў розных эпох і народаў.

Няхай асоба нацыянальнага класіка будзе арыенцірам для ўдзельнікаў юбілейнай канферэнцыі, а яго творчасць натхніць на ўласныя навуковыя знаходкі.

Поспехаў Вам, паважаныя калегі! Плённай і выніковай працы на карысць беларускай навукі і культуры!

*Аляксандр Іванавіч Жук, рэктар БДПУ,*
*доктар педагагічных навук, прафесар*

Репозиторий БГПУ